# Нашы юбіляры

## МІКАЛАЙ АНДРЭЕВІЧ ПАЎЛЕНКА



Споўнілася 60 гадоў Мікалаю Андрэевічу Паўленку, доктару філалагічных навук, прафесару кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна.

М. А. Паўленка нарадзіўся 26 чэрвеня 1926 года ў сяле Савінка Паласаўскага раёна Волгаградскай вобласці ў сялянскай сям'і. Скончыўшы 9 класаў мясцовай сярэдняй школы, працаваў слесарам пры МТС. Са снежня 1943 года па жнівень 1949 служыў у Савецкай Арміі. Будучы ваеннаслужачым, завяршыў сярэднюю адукацыю ў вячэрняй школе і паступіў на аддзяленне рускай мовы і літаратуры завочнага факультэта Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. Праз год, дэмабілізаваўшыся, перавёўся на стацыянар. У 1954 годзе, як лепшы выпускнік са схільнасцямі да навуковай работы, быў рэкамендаваны ў аспірантуру па кафедры рускай мовы і агульнага мовазнаўства. З кастрычніка 1957 года працаваў на гэтай кафедры выкладчыкам, старшым выкладчыкам, затым дацэнтам. Кандыдацкую дысертацыю аб словаўтварэнні ў беларускай мове назоўнікаў пры дапамозе суфіксаў *-ств-* і *-осць(-асць)* абараніў у 1958 годзе. Словаўтварэннем актыўна займаўся і пазней, вынікам чаго з'явілася доктарская дысертацыя аб развіцці беларускага субстантыўнага словаўтварэння (фемінінатывы XIV — 70-х гг. XX стст.), якую абараніў у 1979 годзе.

М. А. Паўленка апублікаваў звыш 130 навуковых прац. Найбольш значныя прысвечаны дэрываталогіі. Манаграфія «Нарысы па беларускаму словаўтварэнню: жаночыя асабовыя намінацыі ў старабеларускай мове» (1978) атрымала высокую ацэнку спецыялістаў. Ён з'яўляецца аўтарам вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў ВНУ «Введение в языкознание» (1962) і «Краткий очерк истории письма» (1965), сааўтарам хрэстаматыі па ўводзінах у мовазнаўства, якая выдавалася двойчы (1977, 1984).

Часта М. А. Паўленка выступае ў друку з артыкуламі аб выкладанні рускай мовы замежным студэнтам. У іх знайшло абагульненне багатага ўласнага вопыту, набытага падчас трохгадовай працы (1966—1968) у Інстытуце рускіх даследаванняў універсітэта імя Дж. Неру (Індыя, г. Дэлі). Як вельмі дасведчаны спецыяліст па гэтых праблемах, М. А. Паўленка ў 1985 годзе быў камандзіраваны ў ЧССР у якасці дырэктара філіяла Інстытута рускай мовы імя А. С. Пушкіна ў Празе, дзе працуе і цяпер.

М. А. Паўленка не толькі на высокім прафесійным узроўні чытае лекцыі, праводзіць практычныя і семінарскія заняткі, але і вельмі ўмела кіруе навуковай работай студэнтаў і выпускнікоў. Некалькі яго савецкіх і замежных аспірантаў ужо паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі.

М. А Паўленка не абмяжоўваецца толькі вучэбнымі і навуковымі абавязкамі. Ён прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці: з'яўляецца членам двух спецыялізаваных саветаў па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый, неаднаразова выбіраўся членам і сакратаром партыйнага бюро філалагічнага факультэта, старастай філасофскага семінара мовазнаўцаў, членам бібліятэчнага савета універсітэта, добрасумленна выконваў многія разавыя даручэнні, у прыватнасці па арганізацыі і правядзенні ва універсітэце навуковых канферэнцый і сімпозіумаў.

Баявыя і працоўныя заслугі М. А. Паўленкі адзначаны медалямі за ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне, Граматамі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР і рэктарата універсітэта.

Высокакваліфікаваны вучоны-мовазнавец, выдатны выкладчык, ініцыятар многіх карысных пачынанняў, просты і добразычлівы чалавек, Мікалай Андрэевіч Паўленка карыстаецца на факультэце вялікай павагай і любоўю. Усе калегі па працы і шматлікія вучні шчыра віншуюць яго з 60-годдзем з дня нараджэння і жадаюць добрага здароўя, новых творчых поспехаў і асабістага шчасця.

І. К. ГЕРМАНОВІЧ